Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Рэгістрацыйны № 12.

# ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

25 СТУДЗЕНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА № 4 (15508)

## ВЕДЫ — У АДКРЫЦЦІ!

**У пачатку лютага ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце пачынае сваю работу 72-ая штогадовая навукова-практычная канферэнцыя.**

Пад дахам БДТУ з 4 па 9 лютага збяруцца вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вядучых вышэйшых навучальных устаноў краіны, прадстаўнікі прамысловасці і лесагаспадаркі. У рамках канферэнцыі будуць дзейнічаць навуковыя секцыі і падсекцыі разнастайных напрамкаў — вучоныя прадставяць вынікі сваіх даследаванняў у галіне хімічнай тэхналогіі, лесагаспадарчай тэхнікі, паліграфіі, эканомікі і кіравання вытворчасцю і г.д.

Традыцыйна акрамя сталых навукоўцаў у рабоце канферэнцыі бяруць актыўны ўдзел маладыя вучоныя і аспіранты, для якіх гэта добрая магчымасць як азнаёміцца з актуальнымі дасягненнямі ў сферы сваіх інтарэсаў, так і прадставіць вынікі асабістых даследаванняў, наладзіць навуковыя сувязі з іншымі спецыялістамі ці зацікавіць прадстаўнікоў вытворчасці. Так, у 2008 годзе на навукова-практычнай канферэнцыі зробяць свае даклады больш чым 60 аспірантаў і магістрантаў. Возьмуць удзел у канферэнцыі і найбольш актыўныя студэнты, якія звязваюць свой далейшы лёс не толькі з практычным выкарыстаннем атрыманых у ВНУ ведаў, але і з укладам у сусветную навуковую скрыню сваіх дасягненняў і, хто ведае, нават адкрыццяў!

**Яраслаў ГРОДА, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры тэарэтычнай механікі БДТУ.**

## СТАРТАВАЎ МІЖНАРОДНЫ ГОД САНІТАРЫІ

**Генеральная Асамблея ААН аб'явіла 2008 год Годам санітарыі.**

Яго правядзенне ў першую чаргу разлічана на маладых людзей, якія нярэдка грэбуюць захаваннем элементарных санітарных нормаў у паўсядзённым жыцці. У выніку моладзь, асабліва дзеці, падлеткі, маладыя жанчыны часцей за іншых пакутуюць ад цяжкіх інфекцыйных хваробаў.

Спецыялісты гавораць, што нават такая простая рэч, як мыццё рук з мылам, дазваляе нярэдка пазбегнуць інфекцыйных захворванняў. Так атрымалася, што Міжнародны Год санітарыі супаў з правядзеннем Года здароўя ў нашай краіне. Іх спалучэнне, думаецца, дазволіць нам, асабліва моладзі, больш адказна ставіцца да выканання нормаў санітарыі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Лідары

# Асабістая справа або грамадзянскі абавязак?

**Вы любіце сваю сям'ю, сваю Радзіму? Лічыце сябе патрыётам? «Што за дзіўнае пытанне?» — скажа, безумоўна, наш чытач.**

**Аднак не ўсё так проста. Мы правялі бліц-даследаванне сярод моладзі з пытаннем: Што такое патрыятызм?» І высветлілі, што ў кожнага свой пункт гледжання.**

**Каб вызначыцца з паняццем «патрыятызм», мы звярнуліся да першага сакратара Мінскага гарадскога камітэта Грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Дзяніса ПРОХАРА, які зусім нядаўна прыступіў да выканання сваіх абавязкаў.**

***— Скажыце, калі ласка, што для вас патрыятызм?***

— Патрыятызм — паняцце вельмі шматграннае, і кожны тлумачыць яго па-свойму. Асабіста для мяне гэта найперш любоў да Радзімы, гордасць за нашы дасягненні і поспехі. Гэта пашана да старэйшага пакалення, даніна павагі іх подзвігам і заслугам. Гэта імкненне быць карысным грамадству сваёй працай, стаўленнем да людзей.

***— Што асабіста для вас Радзіма? Гэта чырвона-зялёны сцяг нашай краіны, герб, гімн, дзяржаўныя святы або гэта месца, дзе вы нарадзіліся, дзе жывяце, лавачка ў бабулі ў вёсцы і родныя пейзажы?***

— Радзіма для мяне перадусім гэта месца, дзе я нарадзіўся, дзе я вырас, дзе пайшоў у школу, гэта месца нараджэння маіх бацькоў. Я раздзяляю паняцці «вялікая Радзіма» і «маленькая радзіма». Вялікая Радзіма для мяне — гэта наша краіна, Рэспубліка Беларусь. Малая радзіма — гэта месца майго нараджэння і станаўлення як асобы. Пачуўшы слова Радзіма, адразу ўяўляю бацькоўскі дом і сваіх бацькоў, наш сад, дзе са сваімі сябрамі ўзбіраўся на яблыні па сакавітыя спелыя яблыкі, родную рэчку і парк, дзе адбылося першае спатканне з каханай.

Для мяне гэта і ёсць любоў да Радзімы. Гэта, мабыць, і ёсць асноўны змест паняцця «патрыятызм».

Патрыятызм для мяне — асноўная рухаючая сіла. Я шчыра не разумею тых, хто ідзе на працу толькі для таго, каб адседзецца. Сёння наша дзяржава дае бясконцае мноства магчымасцяў для самарэалізацыі, стварае спрыяльныя ўмовы для кожнага. І абавязак кожнага грамадзяніна — адказаць на клопат дзяржавы сваёй карыснай, сацыяльна значнай працай.



**ДАВЕДКА «ЧЗ».**
***Прохар Дзяніс Міхайлавіч.***
***Год нараджэння: 1979.***
***Месца нараджэння: г.п. Карэлічы Гродзенскай вобласці.***
***Скончыў: Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, аспірантуру Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.***
***Спецыяльнасць па адукацыі: «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве». Спецыялізацыя: «Прадпрымальніцкая дзейнасць прадпрыемства».***

Выхаваць патрыёта краіны — наша асноўная задача, бо менавіта цяперашнія хлопчыкі і дзяўчынкі заўтра стануць кіраваць краінай.

Выхаваць патрыёта можна толькі асабістым прыкладам. Калі ты, выступаючы з трыбуны, гаворыш высокія словы, а сам ніколі не саступіш месца бабулі ў тралейбусе, то аб якім даверы, а ўжо тым больш патрыятызме, можа ісці гаворка?

Я родам з Гродзенскай вобласці. Скажу па сакрэце, на кожнае свята Дня Перамогі адпраўляю віншаванні ветэранам роднага гарадскога пасёлка Карэлічы. Вядома ж, я не магу павіншаваць усіх ветэранаў, але тых, з кім так ці інакш знаёмы, віншую абавязкова.

Наш гарадскі камітэт БРСМ праводзіць мноства мерапрыемстваў патрыятычнага характару. Гэта сустрэчы, «круглыя сталы», сустрэчы з ветэранамі, «Зорныя паходы» па месцах баявой славы, «Заранкі». Традыцыйна праводзяцца такія мерапрыемствы, як «Мы грамадзяне Беларусі!», «За Беларусь!», прысвечаныя дзяржаўным святам Рэспублікі Беларусь. Праводзяцца спартыўна-патрыятычныя гульні, ваенізаваныя эстафеты, турысцкія злёты і спаборніцтвы, спартакіяды сярод дапрызыўнай і прызыўной моладзі па мнагабор'ю ў рамках комплексу «Абаронца Айчыны» (у тым ліку і выязныя) і інш. Кожны малады чалавек знойдзе сабе занятак па душы.

***— Раскажыце, як праходзяць вашы мерапрыемствы, куды вы ездзіце. Ці падабаецца гэта моладзі, якія ўражанні, успаміны?***

— Мы праводзім вельмі шмат мерапрыемстваў для моладзі сталіцы. Самыя яркія — гэта нашы акцыі. Цяпер моладзь крыху скептычна ставіцца да правядзення вялікіх акцый, але ім вельмі падабаюцца новыя накірункі, веянні — флэш-мобы. Прыкладам можа паслужыць флэш-моб, праведзены ў напрыканцы снежня мінулага года, каб прыцягнуць увагу гараджан да праблемы гандлю людзьмі. Больш за тысячу чалавек выйшлі на вуліцы горада, паклалі рукі адзін аднаму на плечы і прастаялі ў такім становішчы хвіліны паўтары — як нямы дакор рабагандлярам.

Правядзенне летніх турзлётаў па родным краі, летнія турысцкія паходы, розныя патрыятычныя гульні, кубак рыбалкі — усё гэта вельмі падабаецца маладым людзям. У Савецкім раёне вялікай папулярнасцю карыстаецца «Клуб гістарычнай рэканструкцыі», дзе падлеткі аднаўляюць побыт і эпоху сярэднявечча.

***— Сярод моладзі склалася такая думка, што БРСМ занадта фармальная арганізацыя і туды няма чаго ісці. Што вы можаце сказаць адносна гэтага?***

— Найперш наша арганізацыя створана для падтрымання маладзёжных ініцыятыў. Натуральна, БРСМ не можа стопрацэнтна аб'яднаць усю моладзь. Мы падтрымліваем тых маладых людзей, у якіх ёсць крэатыўныя ідэі, якія хочуць змяніць сваё жыццё ў лепшы бок.

***— Ці адрозніваецца, па вашаму, патрыятызм мінулых гадоў ад сучаснага?***

— Не. А хіба можа адрознівацца любоў да маці? Сёння мяняюцца толькі спосабы яе праяўлення. Дзякуй Богу, мы жывём у мірны час, не галадаем, у нас няма экстрэмальных абставінаў, ад моладзі не патрабуецца здзяйсняць баявыя подзвігі, рызыкаваць жыццём. Але часам штодзённая праца патрабуе не меншай мужнасці.

***— Дык усё-такі патрыятызм — гэта асабістая справа кожнага чалавека або грамадзянскі абавязак?***

— Безумоўна, гэта наш грамадзянскі абавязак, як людзей, ад якіх залежыць будучае нашай дзяржавы. Мы не можам жыць у дзяржаве і быць па-за яе праблемамі. Нельга жыць у грамадстве і быць ад яго незалежным. Але патрыятызм — гэта яшчэ і шчырае чалавечае пачуццё, якое ідзе з глыбіні душы. Бо, гаворачы аб любові да Радзімы і патрыятызме, мы гаворым аб сваіх глыбока асабістых эмоцыях і перажываннях.

Грамадзянскі абавязак і асабістая справа павінны ісці поруч.

**Яна ШЫРАНКОВА,** *вучаніца 10- «Г» класа СШ № 54 г. Мінска.*

## ПРЫЗЫ ДЛЯ МУЗЫ

**Тэлеканал АНТ дае «зялёнае святло» песням на беларускай мове. Але не ўсім запар, а толькі тым, якія адпавядаюць умовам конкурсу «Нашы песні-2008».**

Удзел у ім могуць узяць айчынныя кампазітары з беларускамоўнымі песнямі на патрыятычную тэматыку. Пры тым важна, каб песні былі напісаны ў гэтым годзе і раней не выконваліся.

Заяўкі ад кампазітараў прымаюцца да 1 мая на адрас тэлеканала — 220029, г. Мінск, вул. Камуністычная, 6, АНТ, з паметкай «Нашы песні—2008». Аўтары лепшых песень атрымаюць буйныя грашовыя прызы, а іх кампазіцыі прагучаць у адмысловым гала-канцэрце.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## «ФАНЫ» АБЛЮБАВАЛІ АПОШНІЯ ВАГОНЫ

**Беларуская міліцыя трымае пад пільным кантролем футбольных фанатаў.**

Як паведаміў начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС на транспарце Ігар Яўсееў, міліцыянеры загадзя адсочваюць дзеянні футбольных «фанаў», праводзяць размовы з іх лідарамі. «Яны ўжо ведаюць, як трэба ехаць — садзяцца звычайна ў апошнія вагоны, мы іх суправаджаем», — адзначыў Ігар Яўсееў. Паводле яго слоў, летась міліцыя «эскартавала» больш за 6,5 тысячы фанатаў на 67 футбольных матчаў. Найбольш пільна сочаць міліцыянеры за перамяшчэннем футбольных балельшчыкаў у накірунку «Барысаў — Асіповічы — Пухавічы».

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

Ёсць нагода

# СВЯТЫ ДЗЕНЬ СТУДЭНТА

Сёння амаль ці не ўся краіна мае законнае права адзначыць свята — Дзень студэнта. Святам ён з'яўляецца не толькі для тых шчаслíўцаў, якія цяпер адпачываюць пасля зімовай сесіі альбо яшчэ шчыруюць над канспектамі. «Прафесійнай» дата засталася для ўсіх, хто калі-небудзь атрымліваў дыплом, можа нават і не вышэйшай адукацыі. А яшчэ ў дзень гэты праходзяць імяніны Таццяны. І, калі разбірацца, Дзень гэтай святой радасна праводзілі значна раней да таго, як стаў ён яшчэ і Днём студэнта. Так супала, што ў 1755 годзе, 25 студзеня, імператрыца Лізавета Пятроўна падпісала Указ «Аб заснаванні Маскоўскага ўніверсітэта». З таго часу і павялося, ужо ў 60—70-ыя гады XIX стагоддзя Таццянін дзень ператвараецца ў «неафіцыйнае» студэнцкае свята. Спачатку яно адзначалася толькі ў Маскве, прычым вельмі цікава, кожны год станавілася сапраўдным відовішчам. Пасля афіцыйнай часткі, цырымоніі ў будынку ўніверсітэта, не вельмі працяглай дарэчы, пачыналіся народныя гулянні па ўсёй расійскай сталіцы.

Аднак яшчэ раней, у XVIII — першай палове XIX стагоддзя, існавала яшчэ адно студэнцкае свята, калі напрыканцы навучальнага года ў адукацыйных установах былі распаўсюджаны ўрачыстыя акты, у час якіх раздаваліся ўзнагароды, гучалі ганаровыя словы. І ў які ж дакладна дзень студэнту належыць аддавацца весялосці, у рэшце рэшт вырашыў Мікалай І. У сваім Указе ён загадаў святкаваць падпісанне акта аб заснаванні ўніверсітэта. Так 25 студзеня стала і Таццяніным днём, і Днём студэнта. У той дзень афіцыянты намагаліся не засцілаць абрусамі столікі рэстаранаў, бо занадта вясёлыя студэнты часта любілі зрываць іх разам з посудам. Затое паліцыя ў часы Расійскай імперыі нават празмерна нецвярозых маладых людзей у гэты дзень не чапала, наадварот, казырала пры сустрэчы са словамі: «Ці мае патрэбу спадар студэнт у дапамозе»?

Як асобы, якія разам з чытачамі таксама лічаць гэтую дату «сваёй», мы не маглі не спытаць у Таццян, што адбываецца і адбывалася з імі ў дзень іх імянін? І ці з'яўляецца Дзень студэнта святам для іх асабіста?

**Таццяна ШАХАВЕЦ, спецыяльны карэспандэнт, Белтэлерадыёкампанія:**

— Я кожны год забываюся аб гэтым дні, і ўзгадваю толькі тады, калі знаёмыя і родныя пачынаюць мяне віншаваць, прычым яшчэ больш падабаецца, калі робяць гэта нечакана, выдумляюць што-небудзь арыгінальнае. Тады становіцца вельмі хораша на душы. У мяне ёсць запаветная мара — сабраць калі-небудзь усіх знаёмых Таццян і зрабіць разам вялікае свята. Тым больш, што дзве бліжэйшыя сяброўкі таксама мае цёзкі. І мару я арганізаваць не застолле, а менавіта свята, якім можна было б усіх уразіць, зрабіць гасцям прыемныя сюрпрызы.

Да Таццянаў трэба адносіцца рупліва, берагчы іх. Жанчыны, якія маюць гэтае імя, звычайна больш аддаюць свае сілы людзям, больш робяць іншым добрыя справы, чым прымаюць дапамогу ў свой адрас. Таму яны заўсёды маюць патрэбу ва ўвазе і клопаце. І лепшым падарункам для Таццяны з'яўляецца адчуванне, што іх любяць.

**Таццяна ГРАМЫКА, кіраўнік аддзела маркетынгу ЗАТ «Паціо» (сетка магазінаў «Пяты элемент»):**

— Для мяне 25 студзеня заўсёды было святам. На імяніны ўсім Таццянам трэба падносіць падарункі. А яшчэ гэта цудоўная нагода для сяброўскай сустрэчы. Адначасова для мяне яна застаецца і Днём студэнта, таму што я працягваю атрымліваць новыя веды, увесь час удасканальваю сваю адукацыю, і цяпер таксама. Яшчэ ва ўніверсітэцкія часы ў гэты дзень мы разыгрывалі адзін аднаго, наладжвалі вясёлыя конкурсы. І разам з тым Таццянін дзень не павінен быць «агульным» святам, а хутчэй — сямейным. Вось, напрыклад, кожны год мая сям'я сустракаецца з сем'ямі сяброў, таму часам можа атрымацца, што ўвесь святочны дзень я магу правесці не ў адным, а ў некалькіх месцах. Прычым, калі ён прыпадае на будні, на працы мы таксама цёпла адзначаем Дзень студэнта разам з калегамі.

**Таццяна МАРХЕЛЬ, народная артыстка, актрыса Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі:**

— Калі я вучылася, мы не адзначалі гэта студэнцкае свята і імяніны. А калі ж дата стала папулярнай, аказалася, што вельмі прыемна ўвесь дзень чуць сардэчныя словы віншаванняў. З гэтых часоў 25 студзеня для мяне стала святочным, і калі ён надыходзіць, у мяне заўсёды прыўзняты настрой. Я ў гэты дзень разважаю аб тым, што жылі раней такія асобы, як святая Таццяна, якія адрозніваліся ад іншых сваім вялікім лёсам і добрымі ўчынкамі. А потым нарадзіліся мы — звычайныя людзі. І менавіта ў гэты дзень хочацца адарвацца ад Зямлі, і хоць бы на адно імгненне стаць дастойнай, роўнай такой асобе, як святая Таццяна.

**Таццяна ШАБЛЫКА, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Беларуская думка»:**

— У савецкія часы Дзень студэнта не быў распаўсюджаны, і мы ўсе былі дзецьмі тых гадоў. Традыцыі яго прыйшлі да нас не так даўно. Але ў маёй сям'і трое мужчын, якія абавязкова павіншуюць мяне з днём святой Таццяны. Для праваслаўных людзей імяніны з'яўляюцца вялікай падзеяй, і я кожны год стараюся ў гэты дзень прыйсці ў царкву і запаліць свечку.

Для ўсіх людзей, і моладзі, і старэйшага пакалення гэты дзень, як і любая адметная дата, можа з'яўляцца падставай для стварэння добрага настрою, для таго, каб зрабіць адзін аднаму добрае свята, сюрпрыз. І вось у гэтай якасці 25 студзеня — вельмі добрая дата.

**Таццяна ШЭМЕТАВЕЦ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

— Вельмі радаснае, шчаслівае, добрае свята для мяне асабіста. Я заўсёды чакаю яго з нецярплівасцю і задаволена не толькі таму, што гэта «мой» дзень. Ён для ўсёй нашай сям'і — адзін з самых галоўных у годзе, таму што 25 студзеня нарадзілася мая дачка. Гэта, напэўна, быў знак з неба, і таму ў маёй любай дачушкі ўсё складваецца шчасліва, кожны дзень прыносіць нам толькі задавальненне.

**Таццяна АКСАНЧАНКА, студэнтка:**

— Мы ўсёй групай будзем адзначаць свята, для гэтага ўжо заказалі месцы ў кавярні. Аднак яшчэ не скончылася сесія, наперадзе яшчэ экзамен, таму адзначаць буду не вельмі працягла, бо трэба дома сядзець, рыхтавацца па падручніках. А ўвогуле, мы кожны год збіраемся разам. Менавіта Дзень студэнта аб'яднаў нашых аднакурснікаў, пасля першай сесіі мы правялі гэтае свята разам, і тады бліжэй пазнаёміліся, зараз ужо сталі вельмі дружнымі.

У дзень святой Таццяны бацькі заўсёды віншуюць мяне, яшчэ з дзяцінства я ведала пра свае імяніны. Аднак некаторыя з маіх знаёмых дзень гэты лічаць толькі студэнцкім святам.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**




Студэнткі БДУ Таццяна МАЦЮШОНАК, Таццяна УСКОВА, Таццяна ГАРОХАВА.

Каралева спорту

Карына АЛЯКСАНДРАВА:

# «...АДЗІНАЦЦАЦІКЛАСНІКІ АДНОЙЧЫ «ЗАЦІСНУЛІ» МЯНЕ Ў КАЛІДОРЫ. НУ Я І ЎДАРЫЛА...»

***Мужчынскай увагай Карына Аляксандрава не абдзеленая, гэта дакладна. Выходзілі мы з кафэ пасля інтэрв'ю, а на выхадзе нас, дакладней Карыну, ужо чакаў прыхільнік яе прыгажосці. На ламанай рускай мужчына гарачай іспана-італьянскай крыві імкнуўся пазнаёміцца, але Карына была непрыступнай. Мы выйшлі на вуліцу і, развітаўшыся, разышліся ў розныя бакі. Прыхільнік без верхняй вопраткі, якая заставалася ў кафэ, пайшоў за Карынай. Ведаў бы ён, каго праследуе, яго рашучасці, напэўна, збавілася б. Хаця... Дзяўчына-кікбаксёрша — гэта вельмі нават цікава...***

**— Карына, ты, здаецца, нарадзілася ў спартыўнай сям'і...**

— Так, прычым спортам займаліся не толькі мама і тата. Дзядуля і бабуля і на лыжах каталіся, і канькамі захапляліся, зразумела, што ў пасляваенны час складана было трапіць у прафесійны спорт. А вось мае бацькі займаліся прафесійна: мама — кандыдат спорту па лёгкай атлетыцы, яе трэніраваў мой тата, майстар спорту па лёгкай атлетыцы. Так яны, дарэчы, і пазнаёміліся. Мама займалася мнагабор'ем, пяцібор'ем, здаецца, тата — скачкамі ў вышыню. Мама ўвогуле зоркай была. Яе фатаздымкі былі ва ўсіх газетах. Я нядаўна зноў праглядала — у яе сабраны цэлы стос выразак.

Малодшы брат Уладзіслаў, мы яго называем маленькім, хоць яму ўжо 18, займаецца веславаннем. Раней займаўся тайскім боксам, і вельмі паспяхова — выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту. А потым мама вырашыла, што не трэба яму адбіваць галаву. І хоць тата лічыў, што наадварот трэба яго пакінуць у боксе, паколькі ў яго пачаліся поспехі, брат паслухаўся маму. Два гады займаецца веславаннем. Старэйшая сястра Наташа скончыла спартыўныя выступленні па мастацкай гімнастыцы пасля Алімпіяды 2004 года, дзе ў групавых практыкаваннях яны занялі чацвёртае месца.

**— Без тлумачэння твайго выбару віду спорту не абысціся. Раскажы, чаму абрала кікбоксінг, а не, скажам, гімнастыку, як сястра?**

— Спачатку мяне, як і старэйшую сястру, хацелі аддаць у мастацкую гімнастыку. Але з-за высокага росту мяне туды не ўзялі. Гэта цяпер усе гімнасткі высокія, а тады ў секцыі ўсе мне былі па плячо. Да таго ж у мяне і ўзрост для гімнастыкі быў позні, мне тады ўжо споўнілася шэсць гадоў.

**— У лёгкую атлетыку бацькі не думалі аддаць?**

— Я таксама калісьці буду мамай, і сваіх дзяцей не аддам ні ў кікбоксінг, ні ў гімнастыку, ні ў веславанне, бо з уласнага вопыту і з вопыту брата і сястры ведаю, што гэта такое. Можна аддаваць у тыя віды спорту, якія нязведаныя. Гэтак жа і нашы бацькі, напэўна, не захацелі зрабіць з нас легкаатлетаў. Калі мяне не ўзялі ў мастацкую гімнастыку, я пахадзіла крыху на рытмічную гімнастыку. А аднойчы ў перадачы «Асілак» выступала адна дзяўчынка з нунчакамі, і мне спадабалася. І літаральна праз дзень мы з татам пайшлі ў секцыю, і я там засталася. Спачатку я, вядома ж, саромелася. Там у асноўным хлопцы дарослыя, бачаць, што нейкая дзяўчынка «левая», нічога не ўмее... Але паступова я ўцягнулася. У секцыю я трапіла ў верасні, а ў маі ў мяне былі першыя спаборніцтвы — іх я запомню на ўсё жыццё. Я так перахвалявалася, што забыла ўсю кампазіцыю. Усе паўтары хвіліны свайго выступлення я рабіла толькі два элементы: стоечка — удар нагой. З мяне смяяліся ўсе. Потым мне паапладзіравалі, ну і далі, зразумела, апошняе месца. Тады мне споўнілася адзінаццаць...

**— Што такое жаночы кікбоксінг?**

— Ёсць у нас розныя стылі і напрамкі. Ёсць мяккі стыль, гэта штосьці з ушу, шаўлінськае. Жорсткі стыль, калі ўдары браць, то гэта элементы і каратэ, і ушу, і работа са зброяй — меч, нажы, нунчакі. Я цяпер працую з трохзвенным ланцугом — гэта тры досыць доўгія палкі, злучаныя паміж сабой ланцугамі. Дзяўчынка адна з нашай каманды працуе з доўгім ланцугом, на канцы якога востры нож. Я пачынала працаваць з нунчакамі, а калі трэба было ўскладняць праграму, гэта зброя мне не падышла. Уся зброя ідзе з Шоўліня. Каб прасцей было ўявіць, што такое Шоўлінь, то па тэлевізары ўсе, напэўна, бачылі такіх дзядзечак пры манастыры ў аранжавых касцюмах, якія ходзяць па вуглях, па разбітым шкле, пратыкаюць сябе.

**— Філасофію ўсходніх адзінаборстваў дадаткова вывучаць трэба?**

— На пачатковым этапе дастаткова таго, што тлумачыць трэнер. Калі вучышся ва ўніверсітэце, нельга зацыклівацца на чымсьці адным. На факультэце масавых відаў спорту, у прыватнасці на аддзяленні рукапашнага бою, мы вывучаем не толькі рукапашны бой, але і кікбоксінг, і тайскі бокс, і каратэ, і таэквандо. Гісторыю трэба ведаць усю, і прыёмы таксама.

**— Дык табе не страшна хадзіць адной па цёмных завулках...**

— Прыёмамі са свайго віду — з тайскага бокса і з кікбоксінга — я валодаю ў дасканаласці. З іншых відаў таксама ёсць навык. Нягледзячы на тое, што ў мяне сольныя выступленні, на трэніроўках мы стаім у пары. І пару разоў я атрымлівала дастаткова сур'ёзна. А хадзіць па цёмных завулках я ўсё роўна баюся.

**— У жыцці даводзілася карыстацца прыёмамі тайскага бокса?**

— Пабілася я толькі аднойчы. Гэта было ў школе, у шостым класе. Я пайшла ў школу па падручнікі, думала ўзяць новыя, непатрапаныя. Адзінаццацікласнікі «заціснулі» мяне ў калідоры. Спачатку я ўгаворвала іх, але гэта не дапамагала. Ну я і ўдарыла. У мяне была разбіта рука, а ў хлопца зламана сківіца. З крыкам «яна шалёная!» яны збеглі.

**— У дастаткова юным узросце ты стала пераможцай Кубка свету...**

— Юніёрскі Кубак свету, які, як і дарослы, пастаянна цяпер праходзіць у Італіі, я выйграла ў 2003 годзе. Гэта мой любімы медаль. Да яго ў мяне ёсць яшчэ Кубак. Тады я стаяла на п'едэстале і плакала ад радасці. Гэта быў мой першы выезд на сур'ёзныя спаборніцтвы. У 2004 годзе я заняла два трэція месцы, адно са зброяй, другое — без зброі. У 2006 годзе таксама трэцяе месца ў мяккім стылі без зброі. А ў 2005 годзе мяне не выпусцілі за мяжу, не адкрылі шэнгенскую візу. Пасольства пакідае за сабой права нічога не тлумачыць. Калі я туды прыйшла, сказалі, што не верыцца ім, што я кікбаксёрша: «Вам на подыум трэба, а не на рынг». Хоць тады візы адкрывалі ўсёй камандзе. Я праплакала дні тры, напэўна. Было так крыўдна...

**— Ты, здаецца, вучышся не толькі ва ўніверсітэце...**

— Ужо тры гады я сур'ёзна займаюся англійскай мовай, у тым ліку і з рэпетытарам, хачу ў будучым атрымаць дыплом перакладчыка. Для сябе наведваю курсы цырульнікаў — мне вельмі складана спраўляцца са сваімі валасамі, спадзяюся, прафесійныя веды дапамогуць. Я ўвогуле не магу сядзець на адным месцы, заўсёды хочацца шмат чаго паспець.

**— Кожнае лета ў пачатку чэрвеня вы ездзіце ў П'ячэнцу на Кубак свету. Італія яшчэ не надакучыла?**

— Афіцыйны Кубак свету праходзіць толькі ў Італіі. У Італіі жыццё, безумоўна, адрозніваецца ад нашага. У 60—70 гадоў жанчыны абуваюць туфлі на высокім абцасе, пацеркі, фарбуюць губы і ідуць на сустрэчу, на вячэрнюю прагулку. У іх няма аселага ладу жыцця, яны падарожнічаюць па ўсім свеце. Прыемна, што ў такім узросце людзі вядуць актыўнае жыццё.

У нас увогуле няшмат стартаў — усяго тры ў год. Гэта рэспубліканскія, Кубак свету і чэмпіянат свету або Еўропы. А так у асноўным мы ездзім на паказальныя выступленні ў Польшчу, Латвію, Венгрыю.

**— На спаборніцтвы шмат прыходзіць балельшчыкаў?**

— У Італіі — вельмі шмат. Цяжка выступаць спачатку, калі не ўсе гледачы паспелі зразумець, куды яны трапілі. А потым праз дзесяць хвілін да іх пачынае паступова даходзіць, тады і апладзіруюць, і крычаць «брава». Хоць мяккія цацкі як гімнасткам ці фігурысткам не дораць і натоўпамі за намі не ходзяць — від спорту не такі папулярны. А вельмі шкада, бо кікбоксінг вельмі відовішчны — мы і сальта скачам, і акрабатыка ў нас ёсць, і са спартыўнай гімнастыкі бяром элементы, плюс гэта ўсё з ударамі, са зброяй.

**— Траўмавацца зброяй можна?**

— Запраста. Калі я пачынала, я ўвогуле трэніравалася ў шлеме, таму што ўдары па галаве здараліся вельмі часта. Адна дзяўчынка папрасіла мяне паглядзець, як яна крутку робіць над галавой нунчакамі. І зачапіла сабе лоб канцом нунчакі. Па твары цячэ кроў, я анямела ад страху і не магу ёй нічога сказаць. А яна нават не заўважыла, што сябе парэзала... Мячамі можна парэзацца. У адной дзяўчынкі нага цалкам у шрамах. Яны з'яўляюцца, калі робіш крутку, і не зажываюць да канца. Зламаныя пальцы — гэта звычайная наша траўма. Няправільна крыху прызямлішся — зламаны палец. Спачатку гэтага не адчуваеш — падчас выступлення шмат адрэналіну, а калі пакідаеш пляцоўку, ісці не можаш. Мне, я лічу, пашанцавала, у мяне толькі аднойчы быў зламаны мезенец. Але нягледзячы ні на што, спорт — гэта наркотык, які зацягвае і ўсё. Ніхто з нас нават з-за траўмаў развітацца са спортам не спяшаецца.



Фота з уласнага архіва Карыны АЛЯКСАНДРАВАЙ.

**— Кікбоксінг — суб'ектыўны від спорту...**

— Так, нас ацэньваюць суддзі. Але беларусы — лідары ў свеце, і мы пакуль утрымліваем гэту пазіцыю, хоць расіяне паступова падцягваюцца. Пасля спаборніцтваў суддзі да нас заўсёды падыходзяць і хваляць, таму што ў нас вельмі добрая тэхніка. Калі толькі з'явіўся кікбоксінг, у нас ён адразу пачаў развівацца. Наш трэнер Яўген Аляксандравіч Кацельнікаў, працаваў са спецыялістамі ў Японіі, Амерыцы. У тых жа расіян скачкі прыгожыя, а тэхніка ўдараў, тэхніка валодання зброяй — не вельмі.

**— Ведаю, што ты здымалася ў кіно...**

— Гісторыя з «Беларусьфільмам» у мяне яшчэ з 2001 года. Мяне адбіралі на галоўную ролю ў маладзёжным навагоднім кіно «Бальная сукенка», аднак мой рост падводзіць мяне пастаянна. Паколькі акцёр, які па сцэнарыю павінен быў у мяне закахацца, быў ніжэйшы за мяне, мяне не ўзялі. Сказалі, што калі пярэдні план яшчэ можна зняць — ён паходзіць па скамейцы, а здалёк зняць не ўдасца. Узялі мяне на ролю завадатара ў класе. Былі здымкі бойкі ў школьнай прыбіральні, мяне доўга грыміравалі — пад губу засунулі паралон, намалявалі кроў, карацей, я не вельмі там прыгожая. Гэты фільм паказваюць ужо гады тры пад Новы год у снежні ці пасля Новага года ў студзені. Было яшчэ пару рэкламныхролікаў. У роліку супраць СНІДу я здымалася. Тады я яшчэ вучылася ў вучылішчы алімпійскага рэзерву. Там не тое што наркотыкі, цыгарэты і піва строга забароненыя. І атрымалася, што 1 снежня ў Міжнародны дзень барацьбы са СНІДам, нас вядуць у кінатэатр і ўключаюць ролікі, дзе я здымалася ў вобразе наркаманкі. Я здзіўлялася, як многія потым пыталіся, у тым ліку і дырэктар вучылішча: «Карына, а гэта праўда?»

**— А як ты ўвогуле трапіла на «Беларусьфільм»?**

— Аднойчы да нас на трэніроўку зайшоў рэжысёр з «Беларусьфільма», мы яму спадабаліся, напэўна, і ён паабяцаў, што запросіць нас на здымкі ў рэкламе. Так і паклікалі. Была яшчэ парачка ролікаў, дзе я здымалася ў масоўцы. А хутка будуць здымкі расійска-беларускага фільма, дзе я ў вобразе сакратаркі з нунчакамі, якая замест ранішняй гімнастыкі падымаецца на дах, дзе адпрацоўвае элементы ўсходніх адзінаборстваў, потым у вобразе дзелавой жанчыны прыходзіць у офіс.

**— Ганарар ужо абмеркавалі?**

— Ганарар прапанавалі нармальны, я пагадзілася. Дарэчы, першы свой ганарар за «Бальную сукенку», 90 тысяч рублёў, пайшоў у мяне на праезд у маршрутках — я ездзіла на трэніроўкі, у магазін, на вучобу. Месяц, напэўна, каталася.

**— З акцёрскімі здольнасцямі ў цябе ўсё ў парадку, як можна зразумець...**

— Пакуль ніхто не скардзіўся. Працаваць, безумоўна, няпроста. Кажуць: здымаем апошні дубль. Праходзіць гадзіна і яны ўсё яшчэ здымаюць гэты эпізод. Здымаюць да той пары, пакуль рэжысёр не ўбачыць, што ўсё ідэальна. Паралельна з нашым фільмам здымалі «Каменскую».

**— За ўдзел у конкурсе «Каралева спорту» ты атрымала пуцёўку ў Парыж. Калі збіраешся наведаць горад усіх закаханых?**

— Напэўна, я зраблю сабе падарунак на дзень нараджэння і паеду туды ў красавіку. Гэта будзе не толькі Парыж, але і Амстэрдам з Берлінам. У Парыжы я не была, а вось сястра на спаборніцтвах была сем разоў. І сказала, што паедзе са мной у восьмы. Так што я еду з сястрой...

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Культурныя людзі, якія павінны зарабляць грошы

**Прыкмета часу: пра культуру летуценна ўжо не гавораць. Сярод культурных паказчыкаў ёсць энергазберагальнасць, свой экспарт і імпарт паслуг і нават станоўчае сальда. І добра, калі яно ёсць... Як добра і тое, калі сярод лічбаў і планавых паказчыкаў знаходзяцца моманты, калі сапраўды можна парадавацца за творчыя ідэі і дасягненні.**

Культура павінна будзе прыцягнуць сёлета 114 мільярдаў пазабюджэтных сродкаў, што на 20 працэнтаў больш, чым летась. Разам з тым колькасць платных паслуг для людзей работнікам культуры давядзецца павялічваць.

Прадстаўнік Брэсцкай вобласці Леанід Несцярчук падзякаваў за рашэнне пачаць рэстаўрацыю Касаўскага палаца, які спецыялістамі ЮНЕСКА быў вызначаны як прыярытэтны аб'ект міжнароднага турызму, але выказаў прапанову: выдаць Дзяржаўны спіс аб'ектаў культурнай спадчыны Беларусі. На змену былой гучнай акцыі прыйдзе новая і пракоціцца па краіне з гордым заклікам: «Мы — беларусы!».

У сферы культуры неабходна перагледзець кадравую палітыку, у першую чаргу ў пытанні фарміравання рэзерву кіруючых кадраў. Такую задачу паставіў намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр Косінец. «Пайдзі сёння Валянцін Елізар'еў, або Міхаіл Фінберг, або Радзівон Бас — замяніць іх няма каму. У навучальных установах таксама не падрыхтаваны рэзерв», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

На беларускіх тэлеканалах няма праектаў, аналагічных расійскім «Дзве зоркі», «Калядныя сустрэчы», дзе побач са знакамітымі майстрамі выступаюць і маладыя.

Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» павінен карэнным чынам змяніцца. Акрамя конкурсу вакалістаў сярод дарослых і дзіцячага спаборніцтва трэба арганізаваць конкурс сярод прадстаўнікоў юнацкага ўзросту. У «Славянскім базары» павінны прымаць удзел выключна зоркі. «Адзін канцэрт Тота Кутуньё абыходзіцца ў суму каля Br600 млн. Запрасіце 5—7 такіх выканаўцаў», — сказаў віцэ-прэм'ер.

На арганізацыю міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў гэтым годзе плануецца зрасходаваць каля Br4 млрд.. У 2007 годзе былі выдзелены Br3 млрд 932 млн. Даходы ад мерапрыемстваў фестывалю склалі Br2 млрд. 971 млн.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Прыём макулатуры, шклатары з хаты ў Мінску
Тэл. 2611187, 8 0336 611187

На свае вочы

# «Паўднёвыя вароты з наваротамі»

***На беларуска-ўкраінскай мяжы з'явіўся пагранпераход, аснашчаны сучаснай тэхнікай і абсталяваннем***



*Пункт пропуску «Новая Рудня» адкрылі старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр ЯКАБСОН, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Аляксандр ШПІЛЕЎСКІ, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Вадзім ЗАЙЦАЎ і намеснік дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Васіль ХРОЛ.*

Пункт пропуску «Новая Рудня» сёння цалкам адпавядае сваёй назве. Тут сапраўды ўсё новае: будынкі, абсталяванне, нават праца арганізавана на іншым, больш сучасным узроўні. Цяжка паверыць, што яшчэ 15 гадоў таму тут стаялі толькі некалькі вагончыкаў для мытнікаў і не было ніякай памежнай інфраструктуры. Вартавым мяжы даводзілася несці службу ў экстрэмальных умовах. Пакутавалі і людзі, якія перасякалі тут мяжу. «Дальнабойшчыкам» даводзілася стаяць у даўжэзных чэргах часам па некалькі сутак. Для адпачываючых, якія ехалі ў Крым, перасячэнне гэтага ўчастка мяжы ператваралася ў сапраўднае пекла. Вядома, з цягам часу цывілізацыя дабралася да «Новай Рудні». Аднак сур'ёзная мадэрнізацыя пункта пропуску пачалася толькі ў 2002 годзе. Асноўная частка сродкаў на абнаўленне «Новай Рудні» была выдзелена з бюджэту Саюзнай дзяржавы. Тэхнічнае пераасnашчэнне таксама праводзілася за грошы, выдаткаваныя ў рамках рэалізацыі саюзнай праграмы першачаргова га развіцця мытнай інфраструктуры. Усяго на рэканструкцыю «Новай Рудні» было накіравана амаль 250 мільёнаў расійскіх рублёў.

Грошы былі патрачаны з карысцю не толькі для беларусаў, расіян, украінцаў, але і ў інтарэсах многіх грамадзян Еўропы. Бо праз «Новую Рудню» праходзіць IX транспартны калідор «Хельсінкі — Санкт-Пецярбург — Віцебск — Гомель — Кіеў — Кішынёў — Бухарэст—Александропаліс». Пасля рэканструкцыі пункта пропуску гэты шлях «з фінаў у грэкі» стаў значна зручнейшым. Як падкрэсліў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Аляксандр Шпілеўскі, прапускная здольнасць «Новай Рудні» павялічылася ў 1,5 раза. У прыватнасці, мадэрнізаваны пагранпераход за суткі можа прапусціць 620 легкавых аўтамабіляў, 260 грузавікоў і 15 аўтобусаў. І гэта, як адзначыў Аляксандр Шпілеўскі, не мяжа. Паводле яго слоў, «тэхналогіі ўдасканальваюцца, таму магчыма павелічэнне прапускной здольнасці ў два разы». Калі прагнозы галоўнага мытніка краіны спраўдзяцца, то і ў самыя «гарачыя дзянькі», у сезон летніх адпачынкаў, у «Новай Рудні» знікнуць нават кароткія чэргі. Бо летам кожныя суткі гэты ўчастак мяжы перасякаюць у сярэднім 800 легкавых аўтамабіляў і прыкладна 3 тысячы чалавек. Адметна, што «Новая Рудня» з кожным годам набывае ўсё большую папулярнасць у «дальнабойшчыкаў». За мінулы год, напрыклад, праз гэты пункт пропуску было перавезена каля 150 тысяч тон грузаў. Прыкладна чвэрць усяго «гомельскага транзіту» перамяшчаецца праз гэты пункт пропуску. Найчасцей паслугамі «Новай Рудні» карыстаюцца расійскія перавозчыкі. Як паведаміў начальнік мытнага паста Рыгор Мазанік, дзесьці 25—30 працэнтаў з агульнай плыні складаюць расійскія грузы. Няма сумненняў, што пасля мадэрнізацыі на «Новую Рудню» пацягнуцца яшчэ даўжэйшыя караваны аўтафургонаў, а таксама пасажырскіх і турыстычных аўтобусаў, легкавушак. Грузы і пасажыры тут афармляюцца паводле прынцыпу «аднаго акна». Усё адбываецца вельмі хутка, без аніякай затрымкі і цяганіны. «Сэрвісныя» ўстановы таксама побач. Напрыклад, каб памяняць валюту, не трэба кудысьці бегчы ў пошуках адмысловага шапіка. У памяшканні мытні знаходзіцца разлікова-касавы цэнтр.

Нават праверка падазроных асобаў тут праходзіць даволі аператыўна. Справа ў тым, што пункт пропуску аснашчаны найноўшымі прыладамі кантролю. З дапамогай гэтай тэхнікі мытнікі, не разбіраючы на запчасткі транспартны сродак, могуць зазірнуць у, здавалася б, зусім недаступныя месцы і знайсці схаваны тавар. Ёсць таксама прылада, якая «адчувае» кантрабанду, запакаваную ў запаснае кола аўтамабіля альбо ў паліўны бак. Спецыяльны рэнтгенапарат здольны выявіць у багажы пасажыра забароненыя для ўвозу ці вывазу рэчы, нават калі яны замаскіраваныя пад нейкі бытавы прадмет.

Пункт пропуску абсталяваны і «нябачным бар'ерам» для затрымання асобаў, якія паспрабуюць на аўтамабілі нахабна праскочыць праз мяжу. Падобныя выпадкі, паводле слоў памежнікаў, хоць і не часта, але здараюцца. Раней даводзілася арганізоўваць пагоню за такімі «ліхачамі». Цяпер спыніць парушальніка можна будзе за некалькі секунд. Надзейны бар'ер «вырасце» на яго шляху ў літаральным сэнсе слова з-пад зямлі.

Сучасныя сістэмы відэаназірання і ахоўнай сігналізацыі не дадуць аніякіх шанцаў незаўважна прабрацца праз пункт пропуску пешым парушальнікам. Асабліва любяць «гуляць у такія хованкі» дробныя кантрабандысты, якія імкнуцца ў мяшках і валізах пранесці праз мяжу спіртное, цыгарэты і іншыя рэчы.

А законапаслухмяных людзей у «Новай Рудні» вартавыя мяжы сустракаюць з ветлівай усмешкай. Больш за тое, у дзень адкрыцця абноўленага пункта пропуску першаму наведвальніку мытнікі ўручылі падарунак. Сімвалічна і справядліва, што пашанцавала менавіта беларусу.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**
*Мінск — Новая Рудня — Мінск.*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.08 | 16.35 | 8.27 |
| Віцебск — | 8.04 | 16.19 | 8.15 |
| Магілёў — | 7.59 | 16.25 | 8.26 |
| Гомель — | 7.49 | 16.28 | 8.39 |
| Гродна — | 8.22 | 16.52 | 8.30 |
| Брэст — | 8.17 | 16.59 | 8.42 |

**Месяц**
***Поўня.***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**
***Пр.*** *Таццяны, Пятра, Савы;*
***К.*** *Ірэны, Таццяны, Эльвіры, Генрыха, Мілаша, Паўла, Яна.*

## НАДВОР'Е на заўтра




— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

| 2 гадз. | 5 гадз. | 8 гадз. | 11 гадз. | 14 гадз. | 17 гадз. | 20 гадз. | 23 гадз. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +3..+5°С | КІЕЎ +2..+4°С | РЫГА +1..+3°С |
| ВІЛЬНЮС +3..+5°С | МАСКВА +2..+4°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ -1..+1°С |

Прамая лінія

# МАЯ СЯМ'Я: АД ДАПАМОГІ ДА ЖЫЛЛЯ

**На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Васільеўна ШЭМЕТАВЕЦ і галоўны спецыяліст упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Марыяна Мікалаеўна ЕЎТУШЭНКАВА.**

***(Працяг. Пачатак у нумарах за 23, 24 студзеня.)***

***— Два гады таму наша сям'я стала ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў пад нумарам 30. З таго часу ў аграгарадку было пабудавана спачатку 50, а потым — яшчэ 12 домікаў. Аднак па невядомых прычынах у чарзе мы прасунуліся толькі да 11 нумара, інакш кажучы, домікі давалі людзям, якія станавіліся пасля нас. А адсюль пытанні: па якім прынцыпе павінна прадастаўляцца жыллё ў аграгарадках і куды можна звярнуцца з тым, каб аспрэчыць вядзенне чаргі? Тым больш, што, як падаецца, разлічваць на жыллё мы маем поўнае права — мой муж адпрацаваў 10 гадоў у сельскай гаспадарцы, а я з'яўляюся маладым спецыялістам.***

**Вераніка Міхайлаўна,**
*Крупскі раён*

— Калі вы, Вераніка Міхайлаўна, стаіце ў чарзе па месцы работы, то тут трэба заўважыць, што так званыя «прэзідэнцкія домікі» ў сельскай мясцовасці будуюцца для прыцягнення працоўных рэсурсаў з улікам перспектыў развіцця той ці іншай гаспадаркі з фінансавым удзелам саміх сельгаспрадпрыемстваў. І, адпаведна, кіраўніцтва сельгаспрадпрыемстваў можа прымаць рашэнне, каму ў рэшце рэшт выдзяляць жыллё — тут усё залежыць ад патрэбы ў пэўных спецыялістах. Аднак калі вы стаіце ў чарзе ў выканкаме, то ў дадзеным выпадку (за выключэннем некаторых катэгорый ільготнікаў) жыллё размяркоўваецца менавіта ў парадку чаргі. Але ў любым выпадку з гэтым пытаннем вам ёсць сэнс звярнуцца з пісьмовым запытам у выканкам, прычым там афіцыйны адказ павінны даць на працягу двух тыдняў.

***— Унучку, якая з'яўляецца адзінокай маці і мае траіх непаўналетніх дзяцей, спачатку ўключылі ў склад жыллёва-будаўнічага кааператыва, а потым выключылі толькі на той падставе, што ўнучка пражывае ў сельскай мясцовасці, тады як ЖБК ствараўся ў райцэнтры. Наколькі гэта правільна?***

**Надзея Іванаўна Пятроўская,**
*Уздзенскі раён*

— Справа ў тым, што з 1 верасня мінулага года фарміраванне спісаў на льготнае крэдытаванне для будаўніцтва жылля вядзецца менавіта па месцы жыхарства, інакш кажучы, унучка на самай справе павінна была стаяць у чарзе ў райцэнтры. Разам з тым, на наш погляд, у гэтай сітуацыі многае залежыць ад таго, калі фарміраваўся сам кааператыў — да верасня 2007 года ці пасля. Таму, Надзея Іванаўна, у дадзеным выпадку мы раім вам зрабіць запыт у райвыканкам ці ў аблвыканкам.

Пры гэтым варта заўважыць, што ўнучка, як шматдзетная маці, у выпадку неатрымання льготнага крэдыту можа разлічваць на бязвыплатную субсідыю на будаўніцтва ці куплю жылля. Субсідыя прадастаўляецца ўжо не строга па месцы жыхарства. Аднак трэба мець на ўвазе, што памер базавай долі субсідыі не будзе перавышаць 50 працэнтаў льготна крэдытаванай плошчы.

***— Зараз у нашай сям'і двое непаўналетніх дзяцей, але хутка чакаем трэцяе. У сувязі з гэтым, якім чынам мы зможам палепшыць свае жыллёвыя ўмовы?***

**Таццяна Шкрэд,** *Лагойскі раён*

— Калі з'явіцца трэцяе дзіця, зменіцца ваш статус, і вы, ужо як шматдзетная сям'я, будзеце мець права на першачарговае паляпшэнне жыллёвых умоў. У прыватнасці, пасля звароту ў райвыканкам вас будуць абавязаныя ўключыць у жыллёва-будаўнічы кааператыў або аказаць дапамогу на куплю жылля на працягу года. Паколькі вы станеце шматдзетнай сям'ёй, крэдыт выдадуць на 40 гадоў пад 3 працэнты гадавых з разліку на 95 працэнтаў нарматыўнай (па 20 квадратных метраў на чалавека) агульнай плошчы, а на астатнія 5 працэнтаў нарматыўнай плошчы прадставяць бязвыплатную субсідыю. Прычым як сям'і з трыма непаўналетнімі дзецьмі, затым вам пагасяць 50 працэнтаў ільготнага крэдыту.

**Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.**
***(Працяг будзе.)***

Асобы

## Уладзімір Высоцкі: родам з дзяцінства

**У брэсцкім архіве ёсць звесткі пра Уладзіміра Сямёнавіча Высоцкага, які нарадзіўся ў гэтым беларускім горадзе.**

Як, няўжо поўны цёзка — усе ж ведаюць, што любімы акцёр і паэт нарадзіўся ў Маскве, ён сам гаварыў пра гэта ў песні?!. Але не цёзка, такое ж дакладна імя насіў яшчэ адзін чалавек, які жыў доўгі час у горадзе, які ў той час называўся Брэст-Літоўск, — дзед знакамітага артыста. Потым сям'я пераехала ў Кіеў, дзе нарадзіўся яго бацька Сямён Уладзіміравіч, далей быў яго шлях у Маскву, дзе ў 1938 годзе з'явіўся на свет яго сын Валодзя...

Сёння, у дзень, калі артысту споўнілася б 70 гадоў, яго ўспамінаюць у Беларусі многія людзі, якія ім захапляліся, любілі яго песні ці з якімі перакрыжаваўся яго шлях хоць на момант. Так склалася, што талент і жаданне працы прывяло Уладзіміра Высоцкага ў Беларусь — беларускія рэжысёры кіно вельмі хацелі яго здымаць у сваіх карцінах, часта знаходзілі для гэтага магчымасці насуперак патрабаванням ідэолагаў. Для кіно Высоцкага адкрыў Віктар Тураў, запрасіўшы на ролю ў фільме «Родам з дзяцінства». Далей былі іншыя моманты супрацоўніцтва з «Беларусьфільмам». Уладзімір Высоцкі стаў для нас зусім не чужой і не далёкай зоркай.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Дзве даты — 25 студзеня

**1323 год** — 685 гадоў таму вялікі князь ВКЛ Гедымін пачаў будаўніцтва Лідскага замка, вакол якога паступова вырас горад. Замак уваходзіў у лінію крапасных умацаванняў Навагрудак — Крэва — Меднікі — Трокі. З'яўляецца помнікам абарончага дойлідства.



**1938 год** — нарадзіўся Уладзімір Высоцкі, выдатны савецкі акцёр тэатра і кіно, паэт, бард. Лаўрэат дзяржаўнай прэміі СССР (1987 год, пасмяротна). Дзед яго, Уладзімір Сямёнавіч Высоцкі, нарадзіўся ў Брэсце, доўгі час ён жыў тут (звесткі аб ім захоўваюцца ў мясцовым архіве).

**Цытата дня:**

***«Разумны чалавек бачыць перад сабой невымяральную сферу магчымага; чалавек недалёкі лічыць магчымым толькі тое, што бачыць перад сабой».***

**Дэні Дзідро (1713—1784), французскі філосаф, пісьменнік.**

## Усміхнёмся!

**Торт, які падаюць на заканчэнне паспяховай вечарынкі, падобны на ядзерную зброю — як бы яна і ёсць, а выкарыстаць няма ніякай магчымасці.**

☺

Выпадак у сям'і. Званок у дзверы.
— Так, хуценька хавайся! У шафу давай... Не, у халадзільнік...
— Дарагая, але ж я, аднак, твой муж!
— (да дзвярэй) Ідзі адсюль, у мяне муж дома!

☺

**Ваенкамат хаваўся ад Мікалая Валуева, пакуль таму не споўнілася 27 гадоў.**

☺

— Чулі, італьянскі «Мілан» купіў Ранальда за 7 мільёнаў долараў...
— Гэта на рускія колькі?
— Ну, недзе 4 тысячы Алдоніных...

Да дня беларускай навукі!

# ТАЯМНІЦЫ НАНАСВЕТУ

**Новы лагічны крок у развіцці навукаёмістых вытворчасцяў — выкарыстанне нанатэхналогій. Лічыцца, што пакуль гэты накірунак даследаванняў знаходзіцца на пачатковым этапе свайго развіцця, аднак пэўныя дасягненні ўжо зроблены. Якія поспехі ў галіне нанатэхналогій сёння маюцца на рахунку беларускіх вучоных журналісту «Звязды» расказаў намеснік дырэктара Інстытута цепла- і масаабмену імя А. Лыкава, доктар тэхнічных навук Сяргей ЧЫЖЫК, які ўзначальвае аддзяленне нанапрацэсаў і нанаматэрыялаў.**

— Самае складанае ў нанатэхналогіі — навучыцца працаваць з аб'ектамі памерам у некалькі нанаметраў, — расказвае Сяргей Антонавіч. — Гэта вельмі малая велічыня: калі міліметр падзяліць на тысячу, а потым яшчэ раз на тысячу, то застанецца якраз адзін нанаметр. Нанатэхналогія «працуе» з аб'ектамі, чые памеры не перавышаюць 100 нанаметраў. Асноўная цяжкасць тут — іх візуалізацыя, вызначэнне і маніпуляцыя з імі.

***— Значыць ёсць падставы меркаваць, што з часам мы навучымся сінтэзаваць, скажам, малако не горш за карову? Увогуле, зможам «збіраць» з асобных атамаў і малекул любыя неабходныя нам матэрыялы?***

— Да гэтага яшчэ вельмі далёка. Пакуль вучоныя вучацца атрымліваць такія «дробныя» элементы, ствараць патрэбныя ўмовы для таго, каб прыродныя працэсы самі скіроўваліся ў бок зборак нанааб'ектаў. У першую чаргу тут трэба ўзгадаць вугляродныя нанатрубкі і фулярэны — элементы нанапамеру (гіганцкія малекулы), якія складаюцца выключна з атамаў вугляроду і адрозніваюцца адзін ад аднаго сваёй формай. Фулярэн — сфера, якая складаецца з 60 атамаў вугляроду, а нанатрубка, як можна здагадацца з назвы, мае форму трубкі, працягласць якой можа дасягаць нават міліметра. Фулярэны і нанатрубкі — завершаныя вугляродыя элементы з унікальнымі механічнымі якасцямі, яны могуць быць электра- і цеплаправаднікамі, могуць быць рэзанатарамі, імітарамі выпраменьвання (што важна для стварэння элементаў сучаснай электронікі, манітораў новага пакалення і г.д.). Акрамя таго, нанатрубкі могуць быць «камерамі захоўвання» і сродкам транспарціроўкі, напрыклад, лекавых прэпаратаў у клетку...

Для нас сёння першарадным з'яўляецца стварэнне нанакампазітных матэрыялаў, якія нададуць новыя якасці нават звыклым матэрыялам, такім, як, напрыклад, бетон, фарбы, лакі, палімеры, металы... Між іншым, магчыма, работы ў гэтым накірунку дапамогуць раскрыць, нарэшце, сакрэты тэхналогіі булатнай сталі. Наш інстытут яшчэ гадоў 7 таму сканцэнтраваў свае намаганні ў галіне асваення нанатэхналогій. У першую чаргу для нас было важным асваенне працэсаў і тэхналогій атрымання вугляродных нанатрубак. Пад кіраўніцтвам дырэктара нашага інстытута акадэміка Сяргея Жданка даследчыя групы кандыдатаў фізіка-матэматычных навук Ігара Буякова і Андрэя Краўкліса распрацавалі свой арыгінальны шлях: у дугавым разрадзе атамы вугляроду спачатку вызваляюцца з газавай фазы, а потым пры наяўнасці металічных каталізатараў структурыруюцца ў нанатрубкі і фулярэны. Далейшая наша задача: павялічыць аб'ёмы вытворчасці гэтых працэсаў. Сёння лабараторныя ўстаноўкі працуюць з паказчыкамі сотні грамаў у гадзіну, трэба выйсці на кілаграмы. Мы маем заказы на набыццё нашага абсталявання і тэхналогій з Расіі, Саудаўскай Аравіі, шэрагу іншых краін.



*Участак малекулы ДНК.*

Нанатрубка пры малой вазе мацней за сталь у дзесяткі разоў. Яна мае ўнікальную здольнасць «працаваць» як цэнтр крышталізацыі. Дастаткова нязначнай (сотай, тысячнай) долі працэнта ўтрымання нанатрубак у матэрыяле, для таго каб пераўтварыць усю яго структуру згодна з тымі законамі ўзаемадзеяння, якія «задаюць» азначаныя нанаэлементы. Перабудоўваецца ўся крышталічная рашотка, пачынаючы з атамарнага ўзроўню, у выніку чаго бетон, фарбы, гума, палімерныя валокны і плёнкі, металы і іншае набываюць новыя якасці: павышаную трываласць, меншы час ацвярдзення і г.д. Гэтыя работы мы вядзём паралельна ў двух накірунках: ствараем новыя матэрыялы, знаходзім ім прымяненне і адначасова працуем над асваеннем масавай вытворчасці.

***— Вы ўзгадвалі, што нанатрубкі можна выкарыстоўваць як своеасаблівы транспарцёр для дастаўкі ў клетку лекавых сродкаў. Якое яшчэ прымяненне маюць нанатрубкі ў медыцыне?***

— Ёсць шэраг даследаванняў, якія мы праводзім сумесна з медыкамі. Адно з іх тычыцца пошуку сродкаў барацьбы з ракавымі клеткамі крыві. Мы вывучаем працэсы асаджэння на клетках часціц калоіднага золата дыяметрам некалькі дзесяткаў нанаметраў. Пры стварэнні адпаведных умоў золата будзе асядаць выключна на ракавых клетках і паглынацца імі. Пад уздзеяннем лазернага імпульсу ў часціцах золата пачынаецца генерацыя цяпла і клетка ўзрываецца. Работа гэта вельмі патрэбная. Значны ўклад у яе ўнёс наш супрацоўнік, доктар тэхнічных навук Дзмітрый Лапотка.

Увогуле, вывучэнне ўзаемадзеяння жывых і нежывых структур на нанамаштабе — вельмі цікавы накірунак. Мы цяпер ставім перад сабой задачу прасачыць узаемадзеянне з нанатрубкай малекулы ДНК.

***— ДНК — носьбіт інфармацыі. Які дадатковы карысны патэнцыял у ёй убачылі вучоныя?***

— Цяпер пачынаюцца работы па выкарыстанні ДНК у субмікроннай і нанаэлектроніцы, дзе ДНК выконвае функцыю праваднікa электрычнага току. Іншым спосабам стварыць такі мікрапамер праваднікa чалавеку было не пад сілу, а прырода — стварае мільёны гадоў.

***— Падобныя работы праводзяцца і ў іншых навукова развітых краінах?***

— Так. Заўважу: калі ў галіне высокіх тэхналогій мы здолеем ствараць тое, што і астатнія краіны, і ствараць на самым высокім перадавым узроўні, — наша дзяржава будзе мець высокі міжнародны статус і значны эканамічны эфект, нас ніхто не назаве «бананавай рэспублікай».

***— Для таго каб вывучаць якасці нанаэлементаў і тым больш ствараць на іх аснове новыя матэрыялы, неабходна для пачатку добра разгледзець сам аб'ект. Значыць, патрэбны адпаведныя дыягнастычныя прыборы.***

— Сапраўды, поспех нанатэхналогій магчымы толькі ў тым выпадку, калі мы зможам бачыць нанаэлементы, перамяшчаць іх, рэгістраваць вынікі даследаванняў, дыягнаставаць атрыманыя матэрыялы. І ў гэтым нам дапамагае ўнікальны метад сканіруючай зондавай мікраскапіі.

Першы тунэльны мікраскоп быў створаны ў свеце ў 1982 годзе. Яго стваральнік Б. Рурэр атрымаў Нобелеўскую прэмію. Менавіта пасля гэтага пра нанатэхналогіі пачалі гаварыць як пра сур'ёзную галіну навукі. З канца 80-х гадоў работы ў азначаным накірунку распачаліся і на Беларусі. Крок за крокам мы прыйшлі да стварэння айчыннай мадэлі атамна-сілавога мікраскопа. У адрозненне ад мікраскопаў іншага тыпу з высокай распазнавальнасцю, гэты дае трохмерную камп'ютарную выяву аб'екта. Акрамя таго, мы ў прамым сэнсе можам «памацаць» аб'ект. Зонд адначасова дзейнічае і як вока, і як інструмент дотыку. Акрамя таго, ён здольны перамяшчаць асобныя атамы і ствараць новую структуру. Дзякуючы атамна-сілавому мікраскопу мы маем цікавыя вынікі ў нанатамаграфіі, сілавой спектраскапіі, нанасвідраванні. Гэта вельмі навукаёмісты прыбор, наш разведчык у нанасвет. Сёння мы змаглі выйсці і на сусветны рынак навуковага абсталявання. Нашы мікраскопы ёсць у Расіі, ва Украіне, у Польшы, Літве, Паўднёвай Карэі, Славеніі, на Тайвані. Сёлета паступілі заказы з Казахстана і Саудаўскай Аравіі.

**Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.**

**Атомно-силовой микроскоп**
в комплекте с управляющим программным обеспечением и средствами обработки изображений предназначен для измерения и анализа микро- и субмикрорельефа поверхностей, объектов микро- и нанометрового размерного диапазона с высоким разрешением (до 1 нм).
**ОБЛАСТИ ПРИМЕНЕНИЯ:**
- физика твердого тела;
- тонкопленочные технологии;
- нанотехнологии;
- микроэлектроника;
- оптика;
- прецизионная механика;
- вакуумная техника и др.

***Атомно-силовой микроскоп может использоваться в учебных, научных и промышленных лабораториях.***



Производитель — **ОДО «Микротестмашины»,**
тел. (80232) 71 54 63.
УНП 490001529
Разработка и методологическое сопровождение совместно с **Институтом тепло- и массообмена НАН Беларуси,**
тел. (8017) 284 21 37, факс: (8017) 292 25 13.
УНП 100029077

Сітуацыя

# П'ЯНАЯ НОЧКА КАЛЯДНАЯ...

**Трагедыя разыгралася глыбокай ноччу на стары Новы год у в. Жарабковічы Ляхавіцкага раёна. У калодзежы ўтапіўся Віталь Славута — дзевяцікласнік мясцовай школы.**

У гэтую ноч калядавалі напачатку ў роднай вёсцы Зарытава, а затым падаліся за некалькі кіламетраў у Жарабковічы. Прыкладна каля дзвюх гадзін ночы калядоўшчыкі разышліся. Двое вярнуліся назад у Зарытава, а Віталь, прыхапіўшы сваю частку накалядаванага, застаўся ў Жарабковічах і неўзабаве апынуўся ў кампаніі старэйшых хлопцаў, якія таксама сустракалі Новы год і праводзілі Аляксандра С. у войска — той атрымаў павестку.

Да гэтага моманту ўсё больш-менш ясна. А далей многа незразумелага. У прэсе прайшла інфармацыя, прадстаўленая пракуратурай Ляхавіцкага раёна.

З 16-гадовым падлеткам старэйшыя піць гарэлку не сталі, бо ведалі, што ён яшчэ непаўналетні і выставілі яго з хаты, якая на гэты час была пустая, бо гаспадары памерлі і будынак перайшоў тым людзям, якія старых даглядалі.

Віталь быццам бы пайшоў, але неўзабаве хлопцы пачулі крыкі і кінуліся на вуліцу ратаваць няшчаснага. Скакалі ў калодзеж і спрабавалі выцягнуць падлетка, але ланцуг абрываўся... Праз дзве гадзіны прыехалі супрацоўнікі МНС, адпампавалі ваду і дасталі мёртвага. Выратавальнікі прыехалі б раней, калі б атрымалі сігнал своечасова.

Як там усё было, ведаюць толькі пяцёра хлопцаў, якія далі амаль што аднолькавыя паказанні. Зразумела, што ў тую ноч ніхто цвярозым не быў і напэўна ж, каб не гэты фактар, то трагедыі не здарылася б.

Здавалася б, пытанне вычарпана, але калі я наведаў Жарабковічы і зазірнуў у той калодзеж, то зразумеў, што не ўсё ў гэтым здарэнні адназначна — узнікла некалькі пытанняў, на якія павінны быць зразумелыя адказы.

Але да пытанняў мы яшчэ вернемся.

Загінулы быў праблемным падлеткам, і вось што сказала дырэктар Жарабковіцкай сярэдняй школы Святлана Гаўрыленя:

— З Віталем праблем было шмат. Ён стаяў на ўліку, бо любіў выпіць і ў мінулым годзе некалькі разоў разглядаўся на камісіі па справах непаўналетніх. Яго маці штрафавалі, як і аднаго дарослага, з якім падлетак выпіваў і часта сустракаўся з гэтай прычыны. Але ён быў ціхім выпівохам і не буяніў.

Вядома, што пры такой характарыстыцы школьніка хапала людзей, якія ставіліся да яго непрыязна і былі ў іх на тое прычыны. Але хто таго падлетка прывучыў да гарэлкі? Хіба не старэйшыя?!

Маці загінулага працуе даяркай у мясцовым сельгаскааператыве і вось што яна сказала:

— Віталь пайшоў з хаты каля чатырох гадзін дня і толькі ноччу я даведалася, што з ім бяда. У Жарабковічах я ўжо была пасля трох гадзін ночы. МНС яшчэ не прыехала, хлопцы сядзелі ў хаце, а Віталь быў у калодзежы і яго не чутна было. Вось я і думаю: як пры росце пад 190 см ён мог уваліцца ў той калодзеж?

Зразумець маці можна і, магчыма, ёю не ўсё ўспрымаецца адэкватна. Нехта там падказаў, накіраваў, а дзе праўда, цяжка сказаць.

Праблемны падлетак захацеў папіць вады і ўпаў у калодзеж — вось так і закрываецца праблема. Крымінальную справу па факце ў такім разе няма сэнсу ўзбуджаць, чаго пракуратура (на 23 студзеня) і не зрабіла, і гэта яе права.

А цяпер да пытанняў, якія ў мяне ўзніклі пасля наведвання месца трагедыі.

У калодзежы невялікія дзверцы, хоць можна дапусціць, што хлопец усё ж мог упасці, перагнуўшыся над трубой. Глыбіня калодзежа — прыкладна дзесяць трубаў (наколькі ўдалося ў цемры налічыць). Пры такім падзенні павінны былі б быць сур'ёзныя траўмы, а судова-медыцынская экспертыза ўстанавіла, што падлетак захлынуўся ад вады.

А можа, пры падзенні школьнік мог перавярнуцца? Пры такім росце ды ў вузкай трубе малаверагодна.

У сваіх паказаннях старэйшыя сцвярджалі, што двое з іх скакалі ў калодзеж на крыкі. Такое цяжка ўявіць. Але дапусцім і такі варыянт. Дарэчы, хлопцы-выратавальнікі не ўтапіліся ж і нават спрабавалі небараку падняць наверх. А ўбачыўшы, што не здолеюць гэтага зрабіць, пакінулі школьніка і самі вылезлі. Чаму было б не падтрымаць няшчаснага на паверхні, каб не ўтапіўся?

Галоўнае, што ўпушчаны быў момант, бо па гарачых слядах падобнае здарэнне раскрыць намнога прасцей.

Безумоўна, такая разбежка ў часе дае падставы для розных домыслаў.

Вось і хацелася б ведаць, што на самай справе адбылося цёмнай каляднай ноччу.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 438. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12